# З гісторыі школы

Да 1940-га года ў вёсцы Пераганцы існавала польская школа. Знаходзілася яна ў доме Масяля Сцяпана Савельевіча. Настаўніца школы Ядвіга Гжебінувна вельмі добра грала на скрыпцы. Маці гаспадара дома варыла чай для вучняў.

У 1940-м годзе была пабудавана новая школа людзьмі з Ашмянаў. Гэта быў двухпавярховы драўляны будынак на ўскраіне вёскі. У ваенны час у школе жылі бежанцы з Расіі.

У час Вялікай Айчыннай вайны новы будынак школы згарэў, прыйшлося адбудоўваць нанова. Для школы з вёскі Антонава перавезлі дом гаспадара Вільбіка, а будавалі школу мясцовыя жыхары - сям'я Ягела.

У 70-ыя гады прыбудавалі цагляную частка школы.

У 2007-м годзе школа рэарганізавана з Пераганцаўскай базавай школы ў навучальна-педагагічны комплекс «Пераганцаўскія яслі-сад - базавая школа".

У 2010-ым годзе школа адзначыла сямідзесяцігадовы юбілей.

У рамках будаўніцтва аграгарадка Пераганцы ў 2010-ым годзе быў праведзены капітальны рамонт у будынку школы.



Кіраўнікамі школы ў розныя гады працавалі Сцепаненка І.М., Байкоў Н.А., Мандрык А.Т., Церашонак І.У., Гуткін В.М. Трыццаць гадоў на пасадзе дырэктара працавала Мялько В.І., дванаццаць гадоў - Гурневіч Н.Ф.

У 2011 - 2014 гадах дырэктарам НПК з'яўлялася Лазоўская Н.М., а з верасня 2014 года па красавік 2016 года - Тарчынскі П.В. З кастрычніка 2016 года ўстанову адукацыі ўзначальвае Павайба А.Ю.

01.09.2022 года дзяржаўная ўстанова адукацыі «Навучальна-педагагічны комплекс «Пераганцаўскія яслі-сад - базавая школа" перайменавана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Пераганцаўская базавая школа» (рашэнне Воранаўскага раённага выканаўчага камітэта ад 15.08.2022 № 487).

Кожному вучню кавалачак сэрца,

Маленькую частку яна аддае,

А колькі было іх!..

Таму, мне здаецца,

Што быццам бязмежнае сэрца яе.

І трэба тут быць не пасрэдным акцёрам,

Таму, у якога натхнення няма,

А творчай асобай, крыху фантазёрам,

Каб тое, што робім,

Не знікла дарма.

Настаўнік— не праца, а талент, прызванне,

Далёка не кожны ім здолее быць.

Нялёгкая справа—дзяцей выхаванне,

Душу трэба ўкласці, каб іх навучыць.



# Мялько Валянціна Іванаўна

Мялько Валянціна Іванаўна нарадзілася 12 мая 1936 года ў в. Купіск Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Адукацыя вышэйшая. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я.Купалы па спецыяльнасці настаунік матэматыкі.

Працоўную педагагічную дзейнасць пачала ў якасці піянерскай важатай у 1955г. у Парубішскай сямігадовай школе Воранаўскага раёна.

З 1964 па 1968гг. працавала дырэктарам гэтай жа школы і настаўнікам матэматыкі. У 1968г. школа была рэарганізавана, а Валянціну Іванаўну перавялі ў Пераганцаўскую васьмігодку.

У той час тут займалася каля 200 вучняў. Школа была маленькая, папярэднім дырэктарам Гуткіным Уладзімірам Міхайлавічам было распачата будаўніцтва прыстройкі да школы. Валянціна Іванаўна і закончыла яго ў 1970 г. За гады працы ў школе была ўзнагароджана 2-мя Ганаровымі Граматамі Міністэрства адукацыі БССР, ордэнам “Знак пашаны”.

Валяніна Іванаўна прымала актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, неаднаразова выбіралася дэпутатам сельскага Савета народных дэпутатаў, раённага Савета. Заўсёды старалася дапамагчы людзям, якія да яе звярталіся.

Пасля дасягнення пенсійнага ўзросту працавала яшчэ 8 гадоў. З самага пачатку адкрыцця дзіцячага лагера “Рамонак” і на працягу 11 гадоў была яго бяззменным начальнікам у час летняга адпачынку.

У 2023 годзе  ветэран працы Мялько В.І. была занесена ў Кнігу славы Воранаўскага раёна (рашэнне Воранаўскага раённага выканаўчага камітэта ад 18 жніўня 2023 года № 488).








## Міцкевіч Ганна Барысаўна

Міцкевіч Ганна Барысаўна нарадзілася ў 1921г. у Слуцкім раёне Мінскай вобласці. За два гады да Вялікай Айчыннай вайны паступіла вучыцца ў Слуцкае педвучылішча. Але пачалася вайна, вучобу прыйшлося перарваць. Бацька загінуў у час вайны, маці было вельмі цяжка з малымі дзецьмі ( у сям'і было чацвёра дзяцей, з іх Ганна—старэйшая).

Прыходзілася дапамагаць маці. Сям'і жылося цяжка, аб гэтых гадах Ганна Барысаўна нават не любіь успамінаць.

Вучобу змагла прадоўжыць толькі завочна ўжо пасля вайны, скончыла вучылішча ў 1946г. Чатыры гады працавала ў Слуцкім раёне, затым па загаду Міністэрства адукацыі БССР была пераведзена ў Гродзенскую вобласць. Так аказалася ў в. Янушэўшчызна Воранаускага раёна разам з сяброукай. Пазней сяброўка выйшла замуж у Вялікія Лукі, а Ганна Барысаўна тут знайшла сямейнае шчасце.

Працавала ў пачатковай школе. Вучняў у першыя гады было многа, у школу ў Янушэўшчызне хадзілі дзеці са Станулянцаў, Андрунаў, Антанова, з навакольных хутароў.

19 гадоў працавала тут, толькі ў 1969 годзе школу закрылі і перавялі Ганну Барысаўну ў Пераганцаўскую школу ў якасці настаўніцы пачатковых класаў. Яшчэ 10 год працавала ў Пераганцах, а з 1979 г. знаходзіцца на заслужаным адпачынку. У 1979 г. узнагароджана медалём “Ветэран працы”.



## Раўлушэвіч Ганна Аляксандраўна

Раўлушэвіч Ганна Аляксандраўна нарадзілася ў в.Лыкавічы Мірскага раёна Гродзенскай вобласці (цяпер гэта Карэліцкі раён). Пасля заканчэння Турэцкай сярэдняй школы паступіла ў Баранавіцкі настаўніцкі інстытут па спецыяльнасці гісторыя.

Пасля заканчэння інстытута ў 1955г. была накіравана ў Воранаўскі раён, у Парубішскую сямігадовую школу. Там працавала сем гадоў, вяла актыўную грамадскую работу: удзельнічала ў падпісцы займаў, вучыла непісьменнае і малапісьменнае насельніцтва, хадзіла па вёсках чытаць лекцыі і даклады і г.д.

У 1962 г. па сямейных абставінах перайшла працаваць у Пераганцаўскую васьмігодку. Дырэктарам школы у той час працаваў Гуткін Уладзімір Міхайлавіч, цікавы і здольны чалавек. Настаўніца гісторыі ў школе была, пагэтаму Ганна Аляксандраўна некаторы час вяла геаграфію і нямецкую мову. Дарэчы, нямецкую мову ведала добра, у інстытуце заўсёды вызвалялася ад залікау. Нягледзячы на гэта, вельмі многа працавала над

сабой, наведвала ўрокі лепшых настаўнікаў раёна: Васілеўскай Н.Д., Савашынскай Т.С., Шадзюль М. і інш. Так да пенсіі і выкладала, акрамя гісторыі, нямецкую мову.

Трэба адзначыць, што многія вучні Ганны Аляксандраўны скончылі інстытут замежных моў і працуюць перакладчыкамі, настаўнікамі замежнай мовы (Маркевіч Л.Б., Міхалоўскі В В.).

У 1968 г. дырэктарм школы стала Мялько В.І., з якой і працавалі да выхада на пенсію. Як і раней, Ганна Аляксандраўна вяла вялікую грамадскую працу: узначальвала ў калгасе “Пераганцы” таварыства “Веды”.

За сваю працу неаднаразова ўзнагароджвалася Ганаровымі Граматамі райана, аблана, райкама партыі. Была ўзнагароджана Граматай Вярхоўнага Савета БССР і значком “Выдатнік народнай адукацыі БССР”.



# Мялько Франц Пятровіч

Мялько Франц Пятровіч нарадзіўся 16 верасня 1931 года ў в.Парубішкі Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў мнагадзетнай сям'і. У 1953-1957гг. служыў у арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў шафёрам у калгасе ім. Сталіна .

Бацька Франца Пятровіча загінуў ад рук бандытаў у 1944 г., маці памерла ў 1954, таму вучыцца своечасова не меў магчымасці, так як у сям'і быў старэйшым, патрэбна было дапамагаць падняцца на ногі малодшым.

Аднак у 1969 г. закончыў завочна Пінскі індустрыяльны тэхнікум па спецыяльнасці настаўнік працы і чарчэння.

З 1962 па 1968 гг. працаваў у Парубішскай васьмігадовай школе, а ў 1968г. у сувязі з рэарганізацыяй Парубішскай школы перайшоў у Пераганцаўскую васьмігадовую школу, дзе і працаваў ажно да выхаду на пенсію ў 1999г.

За час працы неаднаразова ўзнагароджваўся Граматамі раённага аддзела адукацыі, а таксама атрымаў медаль "Ветэран працы".



**Ардзевіч Францішка Баляславаўна**

Ардзевіч Францішка Баляславаўна нарадзілася 13 жніўня 1944г. у в. Цёмны Дол Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Вучылася ў Пажыжэмскай пачатковай школе, затым—у Бастунскай сямігодцы.

Працягвала адукацыю ў Воранаўскай сярэдняй школе.

У 1963г. паступіла ў педклас на базе СШ № 15 г. Гродна. У 1971г. закончыла начфак Гродзенскага педінстытута.

Працавала ў школах Воранаўскага раёна: Гудзельскай пачатковай, Навіянкаўскай ВШ, Германішскай ВШ. Даўжэй затрымалася ў Залескай ВШ Жырмунскага с/Савета. Затым нейкі час працавала метадыстам у Воранаўскім райметадкабінеце.

З 1974г. прыйшла на работу ў Пераганцаўскую ВШ, якую ў той час узначальвала Мялько Валянціна Іванаўна. Спачатку працавала настаунікам рускай мовы, геаграфіі, біялогіі, затым была завучам.

Нарэшце атрымала магчымасць працаваць па спецыяльнасці. Першы час пачатковыя класы былі аб’яднанымі, так як было мала вучняў, працаваць было складана. Пазней колькасць вучняў павялічылася, працавала з адным класам, мела свой кабінет. Вельмі многа ўвагі ўдзяляла афармленню

кабінета, доўгі час кабінет Францішкі Баляславаўны лічыўся лепшым у школе.

У Пераганцаўскай школе Францішка Баляславаўна прапрацавала каля 30 гадоў. Па яе словах, працаваць было прыемна, таму што побач знаходзіліся выдатныя педагогі і цудоўныя людзі: Мялько В.І., Раўлушэвіч Г.А., Руцкая Т.А., Савіцкая Г.Ч., Гайдзіс Л.Ф. і інш. 3 2001 г. Францішка Баляславаўна знаходзіцца на заслужаным адпачынку.



## Савіцкая Галіна Чаславаўна

Савіцкая Галіна Чаславаўна нарадзілася 29 лістапада 1950 г. у в. Беняконі Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці.

З 1957 па 1967 год вучылася ў Беняконскай СШ. Актыўна ўдзельнічала ў мастацкай самадзейнасці, была старшынёй савета піянерскага атрада, сакратаром школьнай камсамольскай арганізацыі, брыгадзірам школьнай вытворчай брыгады.

Удзельнічала ў раённых і абласных алімпіядах па матэматыцы, фізіцы.

Пасля заканчэння школы год працавала ў г. Вільні на заводзе вымяральных прыбораў.

У 1968г. паступіла ў Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Я. Купалы на матэматычны факультэт, які і закончыла ў 1974г. завочна.

Год працавала ў Беняконскай школе бібліятэкарам. З 1970 года працавала настаўніцай матэматыкі ў Пераганцаўскай БШ.

Галіна Чаславаўна на працягу ўсёй сваёй працы **(37** гадоў) была класным кіраўніком, прымала актыўны ўдзел у грамадскім жыцці школы, неаднаразова была ўзнагароджана граматамі раённага аддзела адукацыі. У

2007г. выйшла на заслужаны адпачынак. Былыя выпускнікі выказваюць аб ёй толькі цёплыя і шчырыя словы ўдзячнасці.



# Руцкая Тэадора Антонаўна

Руцкая Тэадора Антонаўна нарадзілася 25 студзеня 1947г. у в. Жэлянцы Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці. У 6 гадоў паступіла ў Жэлянскую пачатковую школу. Закончыла з адзнакай. Працягвала вучобу ў Асаўской сярэдняй школе. У 1964 годзе паступіла ў педагагічнае вучылішча пры Гродзенскім педінстытуце ім. Я.Купалы.

Пасля яго заканчэння была накіравана ў якасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры ў Пераганцаўскую васьмігадовую школу.

У 1967 годзе паступіла ў Гродзенскі педінстытут ім. Я.Купалы на факультэт методыкі пачатковага навучання. У 1972г. скончыла, працягвала працаваць у Пераганцаўскай школе ўжо завучам і настаўнікам пачатковых класаў.

Працяглы час была кіраўнікам раённага метадычнага аб'ядняння настаўнікаў пачатковых класаў.

За час працы была ўзнагароджана граматамі Воранаўскага РАА, Гродзенскага абласнога аддзела адукацыі, Ганаровай Граматай Міністэрства адукацыі БССР.

Настаўнік вышэйшай катэгорыі.

На заслужаны адпачынак  Тэадора Антонаўна выйшла ў 2002 годзе, але працавала яшчэ пяць гадоў настаўнікам пачатковых класаў.

Сваю любоў да педагагічнай працы перадала дачцы Алене, якая пасля заканчэння Пераганцаўскай БШ паступіла ў Лідскае педвучылішча, а цяпер працуе ў сваёй жа школе настаўнікам пачатковых класаў.



# Гайдзіс Лілія Фларыянаўна

Гайдзія Лілія Фларыянаўна нарадзілася 23 студзеня 1953 года ў вёсцы Лашакі Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Парубішскую васьмігадовую школу і паступіла ў Ваўкавыскае педагагічнае вучылішча. Пасля заканчэння педвучылішча была накіравана на працу ў Воранаўскі раён. У 1974 годзе паступіла  на завочную форму навучання ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт на гістарычны факультэт. Навучальную ўстанову закончыла ў 1979 годзе. Працавала настаўнікам гісторыі спачатку ў Навіянкаўскай базавай школе, затым – у Радунскай сярэдняй школе. З 1981 года да 2014 года працавала ў Пераганцаўскай базавай школе настаўнікам геаграфіі і гісторыі 1-ай кваліфікацыйнай катэгорыі.

Многа год Лілія Фларыянаўна вяла ў школе гісторыка-турысцка-краязнаўчы гурток. З членамі гуртка настаўніца збірала мясцовы фальклор, краязнаўчы матэрыял пра людзей, вёску, калгас.

З удзелам  Ліліі Фларыянаўны ў  школе быў створаны этнаграфічны куток, які ў 2010/2011 навучальным годзе быў рэарганізаваны ў музейны куток "Сведкі мінуўшчыны".

За час працы Гайдзіс Лілія Фларыянаўна неаднаразова была ўзнагароджана Ганаровымі граматамі РАНА, аблАНА.

Плённа працавала настаўніца з адоранымі вучнямі. Дзеці прымалі актыўны ўдзел у алімпіядах па гісторыі і геаграфіі: Гражынская Вікторыя, якая з 2006

па 2009 год займала прызавыя месцы на алімпіядзе па геаграфіі на раённым і абласным этапах; Валынец  Павел, які прымаў удзел на алімпіядзе па геаграфіі на раённым узроўні. Таксама ў розных конкурсах, мерапрыемствах: Андрыш Надзея, Буклярэвіч Марына,  Малмыга Надзея, Войшніс Валянціна, Кропіс Анастасія, Ягела Вікторыя і інш.

Настаўніцкай дарогай пайшлі і два сыны Ліліі Фларыянаўны: старэйшы – Іван Мар’янавіч – працуе настаўнікам фізічнай культуры і тэхнічнай працы ў Пераганцаўскай базавай школе (закончыў Мазырскі дзяржаўны ўніверсітэт імя І. Шамякіна); малодшы – Павел Мар’янавіч – працуе педагогамарганізатарам у Воранаўскім дзяржаўным каледжы сельскагаспадарчай вытворчасці (закончыў Вільнюскі педагагічны ўніверсітэт).

У 2016 годзе выйшла на заслужаны адпачынак.



## Камінская Таццяна Міхайлаўна

Камінская (Каратай ) Таццяна Міхайлаўна нарадзілася 18 лютага 1953 года ў вёсцы Котлава Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Вучылася спачатку ў Котлаўскай пачатковай школе (1960 – 1964 гг), у 5-ы клас пайшла вучыцца ў Валеўскую агульнаадукацыйную працоўную політэхнічную школу. У 1970 годзе закончыла школу і паступіла ў Гродзенскі тэхнікум фізічнай культуры камітэта па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў БССР. Пасля заканчэння тэхнікума ў 1972 годзе была размеркавана на працу ў Воранаўскі раён выкладчыкам фізічнага выхавання. РАНА накіраваў на працу ў Пераганцаўскую васьмігадовую школу настаўнікам фізічнай культуры. 37 гадоў Таццяна Міхайлаўна працавала ў гэтай навучальнай установе.

Вучні школы на працягу многіх гадоў займалі прызавыя месцы на раённых спаборніцтвах па розных відах спорту: лёгкай атлетыцы, шашках і шахматах, па лыжах. Школа па выніках фізічных паказчыкаў доўгі час была ў ліку лепшых дзесяці школ раёна. Лепшымі спартсменамі школы былі: Савіцкі Павел, Русіновіч Анатолій, Свідзінскі Уладзімір, Габрыяловіч Валянціна, Свідзінская Юлія і інш.

Выпускнікі школы выбралі прафесію настаўнік фізічнай культуры: Гайдзіс Іван, Грышко Аляксандр.

Таццяна Міхайлаўна вяла актыўную грамадскую работу. За сваю працу неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі РАНА, Гродзенскага абкома прафсаюзаў.

У 2009 годзе выйшла на заслужаны адпачынак.

# Яны скончылі нашу школу на “выдатна”

- ✓ Міцко Часлава Чаславаўна
- ✓ Сідаровіч Яніна Антонаўна
- ✓ Сакалоўская Надзея Францаўна
- ✓ Камінская Крысціна Сцяпанаўна
- ✓ Міцкевіч Ганна Аляксандраўна
- ✓ Мялько Галіна Францаўна
- ✓ Цэхановіч Святлана Пятроўна
- ✓ Воўк-Карачэўская Марыя Аляксандраўна
- ✓ Гурневіч Анатолій Мечыславіч
- ✓ Масель Часлаў Стэфанавіч
- ✓ Сцефановіч Галіна Вацлаваўна
- ✓ Кашкевіч Ірэна Іосіфаўна
- ✓ Масель Галіна Стэфанаўна
- ✓ Сакалоўскі Леанід Францавіч
- ✓ Сцефановіч Вольга Вацлаваўна
- ✓ Мікалаевіч Марыя Баляславаўна
- ✓ Макрыцкая Тарэса Станіславаўна
- ✓ Банель Марыя Мечыславаўна
- ✓ Раўлушэвіч Надзея Мар’янаўна
- ✓ Кашкевіч Гэлена Іосіфаўна
- ✓ Воўк-Карачэўская Ганна Аляксандраўна
- ✓ Камінскі Рычард Сцяпанавіч
- ✓ Масель Галіна Іванаўна
- ✓ Цэхановіч Наталля Пятроўна
- ✓ Брынза Валянціна Лявонаўна
- ✓ Біль Ірына Іосіфаўна

- ✓ Войшніс Яніна Мар’янаўна
- ✓ Гурневіч Аляксандр Мечыслававіч
- ✓ Емяльян Тарэса Міхайлаўна
- ✓ Мялько Ірына Францаўна
- ✓ Раўлушэвіч Таццяна Мар’янаўна
- ✓ Савіцкая Надзежда Браніславаўна
- ✓ Воўк-Карачэўская Ядзвіга
- ✓ Руцкі Валерый Часлававіч
- ✓ Дапіра Уладзімір Генрыхавіч
- ✓ Цэхановіч Юрый Пятровіч
- ✓ Маслоўская Ірэна Іосіфаўна
- ✓ Гурневіч Валянціна Мечыславаўна
- ✓ Русіновіч Анатолій Генрыхавіч
- ✓ Смірнова Святлана Аляксандраўна
- ✓ Швакель Аляксандр Міронавіч
- ✓ Ягела Ганна Генрыхаўна
- ✓ Сяховіч Людміла Міхайлаўна
- ✓ Савіцкая Юлія Ягораўна
- ✓ Гайдзіс Ганна Станіславаўна
- ✓ Маслоўская Алена Юзэфаўна
- ✓ Гайдзіс Алена Станіславаўна
- ✓ Емяльян Таццяна Матвееўна
- ✓ Стэфановіч Алена Стэфанаўна
- ✓ Руцкая Алена Чаславаўна
- ✓ Швакель Ганна Міронаўна
- ✓ Гайдукевіч Лілія Вацлаваўна
- ✓ Садоўскі Уладзімір Часлававіч
- ✓ Сцефановіч Ірына Альфрэдаўна

- ✓ Шэшка Ганна Іванаўна
- ✓ Зверка Таццяна Стэфанаўна
- ✓ Швед Алеся Аляксандраўна
- ✓ Вашкевіч Ганна Мар’янаўна
- ✓ Свідзінская Валянціна Мечыславаўна
- ✓ Гурневіч Яўген Аляксандравіч
- ✓ Марцінкевіч Вольга Францаўна
- ✓ Войшніс Валянціна Віктараўна
- ✓ Сцефановіч Вольга Альфрэдаўна
- ✓ Гурневіч Наталля Аляксандраўна
- ✓ Гражынская Вікторыя Леанідаўна
- ✓ Валадзькова Паліна Ігараўна